Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “Спражэнне дзеясловаў.Канчаткі спрагальных формаў”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск

2019

## ЗМЕСТ

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Канчаткі дзеясловаў I спражэння

1.2. Канчаткі дзеясловаў II спражэння

1.3. Рознаспрагальныя дзеясловы

1.4. Вызначэнне спражэння па форме інфінітыва

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычныя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Тэарэтычны раздзел

### 1.1. Канчаткі дзеясловаў І спражэння

**Спражэнне –** гэта змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім і будучым часе абвеснага ладу. У залежнасці ад характару асабовых канчаткаў выдзяляюць два тыпы спражэння дзеясловаў – першае і другое. Дзеясловы І і ІІ спражэння ў цяперашнім і будучым простым часе адрозніваюцца канчаткамі.

Для дзеясловаў ***І спражэння*** характэрны канчаткі:

Адзіночны лік

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1-я асоба | –у (-ю) | *вяду* | *чытаю* | *бяру* | *пішу* |
| 2-я асоба | -еш (-эш, -аш) | *вядзеш* | *чытаеш* | *бярэш* | *пішаш* |
| 3-я асоба | -е (-э, -а) | *вядзе* | *чытае* | *бярэ* | *піша* |

Множны лік

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1-я асоба | –ём (-ем, -ом, -ам) | *вядзём* | *чытаем* | *бяром* | *пішам* |
| 2-я асоба | -яце (-еце, -аце) | *ведзяце* | *чытаеце* | *бераце* | *пішаце* |
| 3-я асоба | -уць (-юць) | *вядуць* | *чытаюць* | *бяруць* | *пішуць* |

### 1.2. Канчаткі дзеясловаў ІІ спражэння

Для дзеясловаў ***ІІ спражэння*** характэрны канчаткі:

Адзіночны лік

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1-я асоба | –у (-ю) | *сяджу* | *маўчу* | *гаманю* | *гавару* |
| 2-я асоба | -іш (-ыш) | *сядзіш* | *маўчыш* | *гамоніш* | *гаворыш* |
| 3-я асоба | -іць (-ыць) | *сядзіць* | *маўчыць* | *гамоніць* | *гаворыць* |

Множны лік

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1-я асоба | –ім (-ым) | *сядзім* | *маўчым* | *гамонім* | *гаворым* |
| 2-я асоба | -іце (-ыце) | *седзіце* | *маўчыце* | *гамоніце* | *гаворыце* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 3-я асоба | -аць (-яць) | *сядзяць* | *маўчаць* | *гамоняць* | *гавораць* |

## 1.3. Рознаспрагальныя дзеясловы

Дзеясловы, якія маюць канчаткі розных тыпаў спражэння, называюцца ***рознаспрагальнымі.*** У беларускай мове да рознаспрагальных адносяцца дзеясловы *бегчы, есці, даць*. Пры змяненні па асобах і ліках у цяперашнім і простым будучым часе яны набываюць канчаткі як I, так і II спражэння:

Адзіночны лік

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1-я асоба | *бягу* | *ем* | *дам* |
| 2-я асоба | *бяжыш* | *ясі* | *дасі* |
| 3-я асоба | *бяжыць* | *есць* | *дасць* |

Множны лік

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1-я асоба | *бяжым* | *ядзім* | *дадзім* |
| 2-я асоба | *бежыце* | *ясце* | *дасце* |
| 3-я асоба | *бягуць* | *ядуць* | *дадуць* |

Дзеяслоў *бегчы* ў 3-й асобе мн. ліку мае канчатак I спражэння, у астатніх – II; *есці, даць* (старажытнае нетэматычнае спражэнне) у 1-й асобе множнага ліку мае канчатак II спражэння, у 3-й асобе – I спражэння, у 1-й асобе – канчатак II спражэння, канчатак 2-й асобы не ўласцівы ні I, ні II спражэнню.

## 1.4. Вызначэнне спражэння па форме інфінітыва

Тып спражэння зручней за ўсё вызначаць па канчатках 2-й асобы адзіночнага ліку і 3-й асобы множнага ліку. Дзеясловы I спражэння у 2-й асобе адзіночнага ліку маюць канчатак *-еш (-эш, -аш)*: *нясеш, бярэш, пішаш*; а дзеясловы II спражэння – канчатак *-іш (-ыш): сядзіш, просіш, гаворыш.* У 3-й асобе множнага ліку да дзеясловаў I спражэння характэрны канчатак *-уць (-юць): нясуць, пішуць, гуляюць*, а для дзеясловаў II спражэння – канчатак *-аць (-яць): гавораць, сядзяць, возяць*.

Вызначыць тып спражэння можна і па неазначальнай форме. Да II спражэння адносяцца дзеясловы, якія ў інфінітыве заканчваюцца на *-іць, -ыць (бяліць, мясіць, варыць, вучыць*), дзе *-і-*, *-ы-* суфікс. Аднаскладовыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўтварэнні ад іх, дзе гэта не суфіксы, -- да I спражэння (*біць, ліць, піць, рыць*); на *–ець, -эць,* калі *–е,* -э не захоўваюцца ў 1-й асобе адзіночнага ліку цяперашняга часу (*глядзець – гляджу, сядзець, гарэць;* выключэнне -- *хацець*), *гнаць, вярцець, цярпець, ненавідзець, стаяць, баяцца, належаць, спаць.* Усе астатнія дзеясловы адносяцца да I спражэння.

## 2. Пытанні да самакантролю ведаў

*1. Якое змяненне дзеясловаў называецца спражэннем?*

*2. Якія тыпы спражэння існуюць у сучаснай беларускай мове?*

*3. Ахарактарызуйце канчаткі дзеясловаў I спражэння.*

*4. Ахарактарызуйце канчаткі дзеясловаў II спражэння*

*5.Чаму некаторыя дзеясловы называюцца рознаспрагальнымі? Назавіце іх.*

*6. Ахарактарызуйце канчаткі рознаспрагальных дзеясловаў.*

*7. Якімі спосабамі можна вызначыць спражэнне дзеясловаў?*

*8. Як вызначаецца спражэнне дзеяслова па асабовых канчатках?*

*9. Як вызначаецца спражэнне дзеяслова па інфінітыве?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 3. Практычныя заданні

**Заданне 1. Падбярыце да кожнай з пададзеных назваў птушак дзеяслоў для абазначэння іх спеваў. Вызначце спражэнне дзеясловаў. Пастаўце інфінітывы ў формы 1-й, 2-й і 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга часу, абазначце канчаткі.**

Бугай, бусел, варона, глушэц, голуб, груган, гусь, драч, зязюля, качка, кнігаўка, курыца, певень, салавей, сініца.

*Словы для даведак:* буркаваць, гагатаць, каркаць, кігікаць, клекатаць, кракаць, крычаць, крумкаць, куваць, кукарэкаць, сакатаць, скрыпець, такаваць, цінькаць, шчоўкаць.

**Заданне 2. Праспрагайце пісьмова дзеясловы, падкрэсліце канчаткі, вызначце спражэнне.**

Браць, спяваць, ляжаць, варочаць, перадаць.

**Заданне 3. Прачытайце тэкст, выпішыце з яго 8 дзеясловаў, укажыце ў дужках спражэнне.**

З усіх сродкаў выхавання, якія ёсць у нас, у людзей, самым выпрабаваным і надзейным было і будзе слова.

Няшчасны на ўсё жыццё той чалавекк, якому не трапіўся настаўнік, які адкрыў бы яму радасць і асалоду далучэння да невыказанага харастава слова, да скарбаў паэзіі. Такі чалавек, дажыўшы веку, наўрад ці палюбіць кнігу, ці будзе мець у ёй друга і дарадчыка.

Нямала нашкодзіла і ўсё яшчэ шкодзіць нам даўняя недаацэнка слова як сродку выхавання. "Непавага да слова, нявер'е ў слова нараджаюць педагагічнае бескультур'е", -- сцвярджаў Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі.

Чаму слова ў аднаго настаўніка – радасць адкрыцця, а ў другога – пакута для вучняў, для выхаванцаў? Не можа быць узаемаразумення, не можа быць тонкіх дуўэўных адносін паміж настаўнікам і вучнем там, дзе пануе коснаязычнасць, убоства думкі, бяскрыласць і беднасць мовы.

Васіль Вітка. "Выхаванне словам"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ